# ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

## XXIV Міжнародны фэст сучаснай харэаграфіі ў Віцебску

СВЯТЛАНА ГУТКОЎСКАЯ

**Артысты, якія самі выходзяць на сцэну, харэографы, якія выносяць на суд пуб- лікі свае творы, абавязкова — свядома або падсвядома — прагнуць поспеху. Асабліва калі гаворка ідзе пра конкурсный спаборніцтвы. Інакш не працавалі б яны гадзінамі ў балетных залах, шлі- фуючы выканальніцкае майстэрства, не займаліся бясконца балетмайстарскім эксперыментатарствам.**

**Самі харэографы, мастацтвазнаўцы, крытыкі і, безумоўна, гледачы шмат спрачаюцца, спрабуючы вызначыць, што забяспечвае поспех мастацкага твора, асобнага выканаўцы ці цэлага культурнага праекта. Ці існуе формула поспеху?**

**У лістападзе ў Віцебску прайшоў чар- говы Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі, які дае багаты матэрыял для таго, каб паразважаць на гэтую тэму.**

Па-першае, сам фестываль адбываецца ўжо 24-ы раз, мае рэпутацыю аднаго з самых прэс- тыжных і паспяховых форумаў у галіне сучаснай харэаграфіі ў СНД і Еўропе. Па-другое, шмат калектываў, балетмайстраў і выканаўцаў упершынюменавітатутатрымалі прызнанне, даведаўшыся, што такое сапраўдны поспех.

Апошніфестывальуключаўусваюпрагра- му як галоўную падзею беларускі конкурс сучаснай харэаграфіі. Конкурс 2011 года можна назваць камерным: у выніку першага адбо- рачнага відэатура да ўдзелу ў мастацкім спа- борніцтвез 14прэтэндэнтаўбылі запрошаны толькі 8 калектываў з Віцебска, Гродна, Мінска і Магілёва. Аднак прафесійны ўзровень бела- рускіх труп сучаснага танца за апошнія гады настолькі ўзрос, што конкурсныя работы арганізатары фестывалю вырашылі адразу паказаць публіцы. Гэтыя абставіны вельмі па- спрыялі асаблівай эмацыянальнасці выступ- ленняў канкурсантаў: прысутнасць гледачоў заўсёды акрыляе артыстаў.

Прадстаўленыя ў конкурсе творы конкур- сная камісія ацэньвала па пяці намінацыях. У гэту камісію ўваходзілі прадстаўнікі чатырох краін, а ўзначальваў яе вядомы харэограф, мастацкі кіраўніктэатра «Кіеўмадэрн-балет» Раду Паклітару (ягоная трупа паказала на фес- тывалі балет «Іп pivo Veritas» на музыку эпохі Рэнесансу і ірландскую фальклорную музыку, а таксама «Балеро» Марыса Равэля).

Як прадказвалі многія, у намінацыі «Лепшая пастаноўка» перамагла работа «Пра балет» на музыку Сяргея Пракоф'ева, ажыццёўленая Дзмітрыем Залескім у Тэатры сучаснай харэаграфіі «D.O.Z.SK.I», якім ён кіруе разам з Вольгай Скварцовай. Харэаграфічная мініяцюра з ярка выяўленай камедыйнай афарбоўкай адпаведна мастацкай задуме пастаноўшчыка будавалася на наўмысным проціпастаўленні лексікі класічнага танца і шаржыраванай сучаснай пластыкі. На годным узроўні былі ўсе складнікі паказанага твора. З дапамогай цікавага пластычнага малюнка, мноства дасціпных знаходак, смелых поз і віртуозных «па» ствараліся мізансцэны, насычаныя актыўным дзеяннем.

Высокі тэхнічны ўзровень і выразнасць удзельнікаў гэтай трупы былі адзначаны і ў намінацыі «Выканальніцкае майстэрства». Падкрэслім, касцяк калектыву складаюць выпускнікі кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастац- тваў. Гэта не дзіўна, калі ўлічыць, што і сам лідар — выхаванец згаданай кафедры, і што кадры на ёй рыхтуюцца на высокім узроўні: маладыя людзі выходзяць адтуль не толькі ўзброенымі неабходнымі прафесійнымі ве- дамі і навыкамі, але і са сфарміраванымі мастацкімі поглядамі, адкрытыя для творчых пошукаў і эксперыментаў. Як для спецыяліс- таў, так і для гледачоў відавочна: у трупе сабраліся аднадумцы. Дадайце да гэтага бясспрэчны талент і майстэрства харэографа. Што можа быць лепей? Магчыма, гэта і ёсць формула поспеху?

Дзіяна Юрчанка, Марына Кушнярова і Сяргей Талкач перамаглі ў намінацыі «Ха- рэограф» — у прадстаўленым на конкурс творы ацэньваліся сцэнічнае ўвасабленне, кампазіцыйнае рашэнне, арыгінальнае ха- рэаграфічнае і вобразнае мысленне аўтараў. Аднаактовы балет «Пераклад» у выкананні Тэатра-студыі сучаснай харэаграфіі з Віцеб- ска быў зроблены на музыку Іагана Себасць- яна Баха і Міхаіла Клімчука. У анатацыі да працы пастаноўшчыкі абмежаваліся толькі вызначэннем паняцця «пераклад». Аўтары не ставілі перад сабою мэты некага здзі- віць і стварылі простае, зразумелае для ўсіх дзеянне, у якім арганічна сінтэзаваліся вы- разныя сродкі танца і драматычнага тэатра. Сапраўдная ігра аднаго героя на акардэоне «пяраўчыла» пластычнаму, вытрыманаму ў стылі contemporary dance «выказванню» двух іншых персанажаў, выступаючы важным элементам ва ўвасабленні ідэі і раскрыцці зместу твора. Фінал быў вырашаны вельмі нечакана і дасціпна: цяпер ужо танцоўшчыкі выйшлі з акардэонамі, дайгралі мелодыю і такім чы- нам«паставілі кропку»ўдзеянні, выклікаўшы шчодры смех глядзельнай залы. Характэрна, што нашы харэографы ўсё часцей працуюць на пазітыўнай хвалі. Безумоўна, яны адчува- юць: гледачы стаміліся ад драмы ў танцы, ад эмацыянальнай напружанасці, якія ўвасабля- юць толькі смутак і адчай.

У намінацыі «Артыстызм» перамаглі Ала Пагоцкая і Аляксандр Філіпаў — салісты ансамбля кафедры харэаграфіі Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Харыз- матычныя выканаўцы стварылі ўхарэаграфіч- най мініяцюры «Давай успомнім» на музыку Алесандра Марчэла пераканаўчыя і шчырыя вобразы. Адточанасць дробных пластычных элементаў і лёгкасць выканання стварылі ўра- жаннебязважкасці рухаў. Бясконцая кантыле- на праяўлялася ў пявучай мяккасці пераходаў ад аднаго «па» да іншага. Але самым моц- ным бокам выканання стаўся дыялог паміж партнёрамі: ён меў прыўзнята-ўсхваляваны характар і гэта вельмі ўзбагачала эмацыйна- эстэтычную сутнасцьхарэаграфічнага тэксту. Адразу два выдатныя дзеячы беларускага балета маюць дачыненне да гэтай перамогі: вядомы харэограф, галоўны балетмайстар Беларускага акадэмічнага музычнага тэатра Уладзімір Іваноў з'яўляецца аўтарам прад- стаўленага твора, Інеса Душкевіч рыхтавала конкурсны нумар з выканаўцамі. Ім таксама пашанцавала навучацца ў яе класічнаму танцу.

Конкурс выявіў і новыя імёны. Два маладыя айчынныя харэографы адразу былі адзначаны ў намінацыі «Пастскрыптум» і атрымалі дыпломы: Улад Цярэшчанка з Гродна з фар- мулёўкай «За чысціню стылю» (мініяцюра «Лібер-танга» на музыку Астора П'яцолы) і Ігар Шувалаў — «За экспрэсію і шчырасць» (мініяцюра «Адзінота» на музыку Джона Вільямса). Першы з'яўляецца выхаванцам Дзмітрыя Куракулава і стварыўсвой праекту межах групы сучаснай харэаграфіі «Тад», другі кіруе ансамблем танца «Алеся» Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

Калі аналізаваць конкурсныя выступленні ўвогуле, нельга не адзначыць: на жаль, ды- япазон творчых пошукаў нашых харэографаў пакуль не вельмі шырокі. Засмучае ў шэрагу работ і адсутнасць зместавай напоўненасці: голая рацыянальнасць кампазіцыі некато- рых твораў не выклікае эмацыйнага водгуку гледача і пакідае яго абыякавым. Часам віда- вочны разрыў паміж фізічнымі магчымасцямі выканаўцаў і тэхнікай танца. Асобныя творы выклікалі спушныя папрокі за недасканаласць тэхнічнага майстэрства танцоўшчыкаў, адсутнасць чысціні і зладжанасці выканання.

Як вядома, у сучасным танцы адбываецца не толькі пошук новых ідэй, форм і прыёмаў арганізацыі пластычнага матэрыялу, але І, так бы мовіць, «лепка» новага цела танцоўшчыка. Таму асаблівую актуальнасць набываюць май- стар-класы прызнаныхспецыялістаўз розных краін.Удзельнікі фестывалю мелі рэдкую маг- чымасць павучыцца і ў іспанскіххарэографаў Альвара Эстэбана і Эліяса Агуэрэ, і ў Віктара Квіджада з Канады, і ў расіянкі Марыі Заплеч- най. Вельмі каштоўна, што, пазаймаўшыся з імі раніцай, увечары можна было ацаніць асаблі- васці творчага метаду замежных харэографаў, паглядзеўшы іх выступленні ў рамках гасця- вой праграмы. А паглядзець было на што.

Спектакль пра сацыяльныя праблемы су-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



«Капітуляцыя».
Балет Яўгена Панфілава.
Перм.



«Давай успомнім».
Харэаграфічная мініяцюра.
Ансамбль кафедры харэаграфіі
БДУ культуры і мастацтваў.
Мінск.



«Метамарфозі-Я».
Фрагмент са спектакля «Кропка зборкі».
Пластычны тэатр «Бармаглот».
Мінск.

часнага грамадства трупы «RUBBERBANDance Group» з Манрэаля на музыку Джаспера Га- хунія ў пастаноўцы Віктара Квіджада, назву якога можна перакласці як «Цэнтр цяжару» («Па-за сілай прыцягнення»), пакінуў моцнае ўражанне. Таленавітая харэаграфія, творчы азарт, самааддача і надзвычайная шчырасць выканаўцаў выклікалі адпаведную рэакцыю глядзельнай залы. Балетмайстар стварыў дынамічнае дзеянне без адзінага шва, з моц- нымі і нечаканымі камбінацыямі вынаходлівых рухаў. Сплаўу пластычных матывах пяці геро- яў спектакля лексікі хіп-хопа, contemporary dance і рухаў класічнага танца — яго візітная картка.

Іншая праява свабоды танца выявілася ў іспанскага дуэта, які прадэманстраваў не-абмежаваныя магчымасці чалавечага цела ў харэаграфіі, натхнёнай рухамі насякомых, з зашыфраваным глыбокім філасофскім пад-тэкстам (мініяцюра «Энтома»), Як заўсёды з поспехам выступіў Пермскі дзяржаўны тэатр «Балет Яўгена Панфілава», упершыню ў Віцебску быў прадстаўлены праект Ільі Ра-манава з Расіі.

Аправай маляўнічай карціны пад назвай «Фестываль» сталі выставы «Сінякі. Мазалі. Кроў. Працоўным будням танцоўшчыкаў прысвячаецца» (надзвычай красамоўная назва!) маскоўскага фатографа Уладзіміра Лу- паўскога і «Харэаграфія ў графіцы» студэнткі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Алёны Махнач.

Але мы разважалі аб формуле поспеху.

Здаецца, надзвычай складана сёння знай- сці надзейных спонсараў (генеральным партнёрам фестывалю выступіў «Белвест», партнёрам — «Белінвестбанк»), выхаваць «сваю» публіку, зацікавіць вядучых спецы- ялістаў, забяспечыць удзел сусветна вядомых калектываў і г.д. Але аўтар ідэі і нязменны дырэктар фестывалю Марына Раманоўская ўпэўнена: іскры новых талентаў, што ўспых-ваюць на фестывальнай сцэне, вартыя любых намаганняў.

І калі формула — гэта дакладнае агуль-нае вызначэнне нейкага правіла, закона, якое ў пэўных умовах можна дастасаваць да ўсіх асобных выпадкаў, то вывесці яе (а мы маем на ўвазе выключна формулу поспеху) у дачыненні да IFMC немагчыма, паколькі гэты фэст — з'ява, безумоўна, унікальная, і пры ўсёй як быццам відавочнасці складнікаў нязменнага поспеху многае ў ёй застаецца загадкавым.

Галоўным жа вынікам XXIV Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі стала выспя- ванне ідэі стварэння Асацыяцыі беларускіх харэографаў сучаснага танца як грамадска-га аб'яднання. Яна горача абмяркоўвалася на тэарэтычным майстар-класе «Беларускі сучасны танец на парозе новага стагоддзя. Праблемы і перспектывы». Спадзяемся, гэта стане «кропкай адліку» і новым этапам у развіцці сучаснага танца на Беларусі. Але заўважу, што надзвычайнае імкненне айчын- ных харэографаў і выканаўцаў да поспеху каштуе, магчыма, значна даражэй, чым сам поспех...^-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ